УЗГОДНЕНА:
на пасяджэнні прафкама
навучэнцаў Ваўкавыскага каледжа
УА "ГрДУ імя Янкі Купалы"

Старшыня прафкама
Шывілька А.П. ________
Пратакол № ___ ад ______ 2011 г.

ЗАЦВЕРДЖАНА:
дырэктар Ваўкавыскага каледжа
УА "ГрДУ імя Янкі Купалы"
________ М.Б. Сямёнчык

загад № 01-07/51
ад 31.08 2011 года

# ПРАВІЛЫ
# унутранага распарадку навучэнцаў Ваўкавыскага каледжа Установы адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"

## 1. Агульныя палажэнні

1.1. Дадзеныя правілы ўнутранага распарадку для навучэнцаў Ваўкавыскага каледжа УА "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы" распрацаваны на аснове і ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь.

1.2. Дадзеныя правілы вызначаюць парадак ажыццяўлення вучэбнай, навукова-даследчай, выхаваўчай дзейнасці навучэнцаў.

1.3. Дадзеныя правілы ўнутранага працоўнага распарадку распаўсюджваюцца на ўсіх навучэнцаў.

## 2. Навучальны і выхаваўчы працэс

2.1.Навучальны працэс у каледжы грунтуецца на аснове прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі і прызваны забяспечыць патрэбнасць грамадства і дзяржавы ў кваліфікаваных спецыялістах, развіццё магчымасцей і інтэлектуальна-творчага патэнцыялу асобы.

2.2. Навучальны працэс у каледжы арганізуецца на рускай і беларускай мовах.

2.3.Прыём заяў і дакументаў і залічэнне абітурыентаў у каледж для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, Правіламі прыёму ў сярэднія-спецыяльныя навучальныя ўстановы, зацвярджаемыя Прэзідэнтам РБ.

2.4.Атрыманне адукацыі ў каледжы ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, у тым ліку на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі (набору), і на платнай аснове.

2.5.Каледж ажыццяўляе сваю дзейнасць на аснове вучэбных планаў, якія забяспечваюць паглыбленую агульнаадукацыйную і прафесіянальную падрыхтоўку, вучэбна-вытворчае навучанне. Разам з асноўнымі дысцыплінамі ў вучэбныя планы ўваходзяць факультатывы, спецкурсы, творчыя заняткі, якія забяспечваюць дыферэнцыяцыю навучання, рознабаковае развіццё і прафесіянальную падрыхтоўку навучэнцаў.

2.6.У каледжы ўстанаўліваецца класна-ўрочная форма навучання і наступныя віды заняткаў:лекцыі, камбінаваныя ўрокі, практычныя, семінарскія, лабараторныя заняткі, вытворчае навучанне (практыка), курсавое праектаванне (работы), кансультацыі, індывідуальныя заняткі і іншыя.

2.7.Атрыманне адукацыі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам РБ, суправаджаюцца бягучай, прамежкавай і (ці) выніковай атэстацыяй. Формы бягучай, прамежкавай і (ці) выніковай атэстацыі вызначаюцца нарматыўнымі актамі РБ.

2.8.Працягласць навучання спецыяльнасцей вызначаецца адпаведнымі вучэбнымі планамі. Пачатак заняткаў - 1 верасня. Вучэбны год складаедца з 2-х семестраў. Тыднёвая нагрузка навучэнцаў абавязковымі вучэбнымі заняткамі не павінна перавышаць 40 гадзін.

2.9.Расклад вучэбных заняткаў складаецца, як правіла, на цэлы навучальны семестр. Ён павінен адпавядаць устаноўленай форме і вывешвацца на спецыяльных інфармацыйных стэндах не пазней, чым за 1 дзень да пачатку заняткаў.

2.10.Устанаўліваецца 6-дзённы вучэбны тыдзень. Працягласць вучэбнай гадзіны - 45 хвілін. Перапынак паміж заняткамі 10 хвілін. На працягу вучэбнага дня ўстанаўліваюцца 2 перапынкі на абед працягласцю 20 хвілін.

2.11.На кожную вучэбную групу заводзіцца журнал вучэбных заняткаў па ўстаноўленай форме. Журнал захоўваецца ў вызначаным парадку. Права карыстання ім маюць выкладчыкі і старасты груп.

2.12.Пачатак і заканчэнне кожнага вучэбнага занятку павінны адбывацца ў строгай адпаведнасці з раскладам.

-на ўдзел у органах самакіравання і рашэння пытанняў дзейнасці установы адукацыі;
-на заахвочванне і ўзнагароду за поспехі ў вучобе, грамадскай дзейнасці, навукова-даследчай рабоце і інш. іншай літаратурай, неабходнай для навучання;
-бясплатнага карыстання ў працэсе навучання вучэбна-вытворчай, культурна-спартыўнай базай каледжа.

Навучэнцы каледжа абавязаны:
-глыбока авалодваць тэарэтычнымі і практычнымі ўменнямі, навыкамі па спецыяльнасці ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам, рыхтавацца да самастойнай працоўнай дзейнасці;
-выконваць у вызначаныя тэрміны ўсе віды заданняў, прадугледжаных вучэбнымі планамі;
-выпрацоўваць уменне самастойна папаўняць веды і выкарыстоўваць іх на практыцы;
-рацыянальна і эфектыўна выкарыстоўваць працоўны час;
-беражліва адносіцца да ўсіх відаў уласнасці;
-рацыянальна выкарыстоўваць энергетычныя рэсурсы, беражліва адносіцца да навакольнага асяроддзя;
-няўхільна выконваць правілы тэхнікі бяспекі, супрацьпажарнай бяспекі;
-быць арганізаванымі, паказваць прыклады ў дысцыплінаванасці, ветлівасці, культуры паводзін;
-выконваць правілы ўнутранага распарадку.

3.3.Навучэнцы каледжа могуць мець іншыя правы і іншыя абавязкі ў адпаведнасці з заканадаўствам РБ, лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі.
3.4.Адукацыйныя адносіны паміж каледжам і навучэнцамі завяршаюцца:
-у сувязі з атрыманнем адукацыі;
-датэрмінова.
3.5.Адукацыйныя адносіны завяршаюцца датэрмінова:
-па ініцыятыве навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца;
-па ініцыятыве каледжа.
3.6.Датэрміновае завяршэнне адукацыйных адносін па ініцыятыве навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца ажыццяўляецца:
- па ўласным жаданні;
-у сувязі з пераводам у іншую навучальную ўстанову;
-па стане здароўя на падставе даведкі ВКК.

2.13.Уваход навучэнцаў у аўдыторыю пасля пачатку заняткаў ажыццяўляецца толькі з дазволу выкладчыка. Навучэнцы, якія спазніліся, абавязкова павінны з'явіцца да загадчыка аддзялення і патлумачыць прычыну спазнення.

2.14.Забараняецца перарываць вучэбныя заняткі, скарачаць іх працягласць, заходзіць і выходзіць з аўдыторыі ў час заняткаў без дазволу выкладчыка.

2.15.Лабараторна-практычныя заняткі праводзяцца з дзяленнем на падгрупы ў колькасці не менш 8 чалавек. Вучэбная група для правядзення заняткаў па фізвыхаванні і дапрызыўной падрыхтоўцы дзеліцца на падгрупы юнакоў і дзяўчат.

2.16.Пры наяўнасці пропускаў заняткаў навучэнцы павінны ў 2-ух тыднёвы тэрмін адпрацаваць вучэбныя заняткі. У выпадку несвоечасовай адпрацоўкі “н” выкладчык выстаўляе адпаведную адзнаку 0 (нуль).

2.17.Семестровыя адзнакі выстаўляюцца выкладчыкам не пазней, чым за 3 дні да заканчэння вучэбных заняткаў у семестры.

2.18.Пазавучэбная дзейнасць навучэнцаў ажыццяўляецца ў разнастайных гуртках, студыях, клубах, навукова-даследчых, спартыўных і іншых аб’яднаннях, накіраваных на рознабаковае развіццё асобы.

2.19.Выпускнікам каледжа, якія паспяхова вытрымалі дзяржаўныя экзамены, абаранілі курсавыя праекты (работы), выканалі патрабаванні вучэбнага плана выдаецца дыплом з прысваеннем адпаведнай кваліфікацыі.

## 3. Правы і абавязкі навучэнцаў

3.1.Навучэнцы каледжа маюць права на:
-выбар факультатываў і творчых заняткаў;
-удзел у алімпіядах, конкурсах, фестывалях і інш.;
-бясплатнага карыстання падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі;

3.7.Датэрміновае завяршэнне адукацыйных адносін па па ініцыятыве каледжа ажыццяўляецца:
-за непаспяховасць па 3 і больш вучэбным прадметам (вучэбным дысцыплінам, практыцы);
-за неліквідацыі акадэмічнай запазычанасці ва ўстаноўленыя тэрміны;
-за непраходжанне выніковай атэстацыі без уважлівых прычын;
-за доўгатэрміновую адсутнасць (больш 30 дзён) без уважлівых прычын на вучэбных занятках на прцягу года;
-за сістэматычнае парушэнне вучэбнай дысцыпліны каледжа і наяўнасць спагнанняў “заўвага”, “вымова” ў межах навучальнага года;
-за невыкананне правілаў унутранага распарадку;
-за неўнясенне аплаты за навучанне ў вызначаныя тэрміны.

## 4. Адказнасць за парушэнне вучэбнай дысцыпліны

4.1.За парушэнне працоўнай, вучэбнай дысцыпліны, у тым ліку норм па ахове працы і санітарнай гігіене могуць прымяняцца наступныя дысцыплінарныя спагнанні:
-заўвага;
-вымова;
-адлічэнне з ліку навучэнцаў каледжа.
Дысцыплінарныя спагнанні аб’яўляюцца загадам дырэктара.
4.2.Выключэнне з навучальнай установы можа быць прыменена як надзвычайная мера спагнання за сістэматычнае непадпарадкаванне выкладчыкам і адміністрацыі каледжа, за грубае парушэнне дысцыпліны, супрацьпраўныя ўчынкі і інш.. Выключэнне навучэнца з каледжа праводзіцца ў адпаведнасці і на аснове палажэнняў Кодэкса РБ аб адукацьй.
4.3.Дысцыплінарныя спагнанні да навучэнцаў каледжа прымаюцца непасрэдна пасля выяўлення праступку, але не пазней 6 месяцаў з дня ўчынення праступку. Тэрмін дзеяння спагнання бмяжоўваецца 1 годам. Калі ў тэты час да навучэнца не прыменена “новае” спагнанне, “старое” адмяняецца.

## 5. Заахвочванні за поспехі ў вучобе і грамадскай дзейнасці

5.1.За ўзорнае выкананне працоўных абавязкаў, поспехі ў вучобе, грамадскай дзейнасці і іншыя дасягненні ўжываюцца наступныя заахвочванні:

-аб'яўленне падзякі;
-грашовае матэрыяльнае стымуляванне;
-узнагароджванне каштоўным падарункам;
-узнагароджванне Граматай адпаведнага ўзроўню.

5.2.Навучэнцы, якія маюць высокія паказчыкі ў вучобе і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці каледжа, устаноўленым парадкам павышаецца памер стыпендыі. Навучэнцы маюць прва на атрыманне іменных стыпендый і стыпендый грамадскіх арганізацый у адпаведнасці з палажэннямі аб іх прызначэнні.

5.3.Заахвочванні аб'яўляюцца загадам, даводзяцца да ведама навучэнцаў каледжа. Выпіска з загада захоўваецца ў асабовай справе навучэнца.

## 6. Заключныя палажэнні

6.1.Штогод у час правядзення сельскагаспадарчых работ адміністрацыя каледжа адлюстроўвае асобна нормы паводзін на час правядзення сельскагаспадарчых работ.

6.2.Змяненні і дапаўненні ў Правілы ўнутранага працоўнага распарадку могуць уносіцца калектывам навучэнцаў па прадстаўленні іх адміністрацыі каледжа ў выпадку, калі яны не пярэчаць дзеючаму заканадаўству.

6.3.Правілы ўнутранага працоўнага распарадку даводзяцца да ведама навучэнцаў.